показательны. Они не только дают возможность расширить их потенциальную аудиторию среди болельщиков и поклонников, но и позволяют почувствовать журналистам печатных массмедиа, а также представителям радио, телевидения и электронных средств массовой информации свою значимость в общем объеме большого потока спортивной информации, которая появляется в информационном пространстве благодаря успешному выступлению белорусских спортсменов на самых знаковых международных стартах.

### Библиографические ссылки


1. Бобруйский городской информационный портал [Электронный ресурс]. URL: http://www.bobr.by.html (дата обращения: 13.05.2021).
2. Могилевский городской информационный портал [Электронный ресурс]. URL: http://www.mogilev.by.html (дата обращения: 12.05.2021).
3. Городская газета «Гомельские ведомости» [Электронный ресурс]. URL: http://www. newsgomel.by.html (дата обращения: 12.05.2021).
4. Областная газета «Витебские вести» [Электронный ресурс]. URL: http:// www. vitvesti.by.html (дата обращения: 16.05.2021).
5. Общественно-политическая газета «Брестская газета» [Электронный ресурс]. URL: http://www. brestgazeta.by.html (дата обращения: 15.05.2021).


## АНАЛІЗ ЮЗАБІЛІЦІ САЙТА ГАЗЕТЫ «ХОЙНІЦКІЯ НАВІНЫ»


***С. В. Зелянко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*siarhejzelianko@gmail.com*



Разглядаюцца пытанні зручнасці карыстання афіцыйным сайтам раённай газеты «Хойніцкія навіны». Вылучаны праблемныя моманты ў юзабіліці інтэрнэт-старонкі перыядычнага рэіянальнага выдання. Сфармуляваны і абгрунтаваны рэдактарскія парады для ўдасканалення працы сайта газеты «Хойніцкія навіны».



***Ключавыя словы:*** юзабіліці сайта; зручнасць карыстання сайтам; раённая газета; сайт выдання; рэгіянальныя СМІ.

# ANALYSIS OF THE NEWSPAPER «KHOINITSKIJA NAVINY» USABILITY

***S. V. Zelenko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: S. V. Zelenko (siarhejzelianko@gmail.com)*

The convenience of using the official website of the district newspaper «Khoinitskija Naviny» is considered. Problematic points in the usability of the website of the regional periodical are highlighted. Editorial advice to improve the site of the newspaper «Khoinitskija Naviny» is formulated and grounded.

***Key words:*** usability of the site; ease of use of the site; district newspaper; newspaper site; regional media.

Рэдакцыя газеты «Хойніцкія навіны» сёлета адзначыць слаўны юбілей – 5 снежня споўніцца 90 год з дня выпуску першага нумара выдання. За шматгадовую гісторыю існавання газеты яе назва некалькі разоў змянялася. Ад 2 ліпеня 2009 г. выданне носіць найменне, якое, у адрозненне ад папярэдніх метафарычных назваў («Ленінскі сцяг», «За Радзіму», «Новы шлях»), рэпрэзентуе патэнцыйным і наяўным чытачам акрэсленую тэрытарыяльную прыналежнасць медыя (Хойніцкі раён Гомельскай вобласці Рэспублікі Беларусь) і яго асноўнае функцыянальнае прызначэнне (інфармаванне аўдыторыі, збор і распаўсюджванне навінавай інфармацыі).

У адпаведнасці з патрабаваннямі часу рэдакцыя раённага выдання надае пільную ўвагу не толькі традыцыйнаму папяроваму фармату трансляцыі навін, але і інтэрнэт-старонцы газеты: «У кастрычніку 2018 года быў зроблены рэдызайн сайта. Новы сайт адрозніваецца візуалізацыяй, адаптаваны для мабільных прылад і адпавядае ўсім сучасным стандартам інтэрнэт-журналістыкі» [1]. Безумоўна, падобная дыверсіфікацыя працы журналістаў з’яўляецца яскравым сведчаннем разумення рэдакцыйным калектывам газеты «Хойніцкія навіны» цікавасцяў інфармацыйнага грамадства, а таксама спробай утрымання і пашырэння аўдыторыі, асабліва моладзевай, паколькі «найбольш успрымальнай да разнастайных інавацый і сацыяльных выклікаў, а таксама першай у перайманні і трансляцыі найперадавога (станоўчага) вопыту з’яўляецца моладзь» [2, с. 275]. Наяўнасць у калектыве рэдакцыі

газеты «Хойніцкія навіны» пасады рэдактара інтэрнэт-рэсурса [3] як спецыяліста «па стварэнні і распаўсюджванні кантэнту (тэкставай, графічнай, аўдыя- і відэаінфармацыі), які працуе ў рэдакцыі інтэрнэт-выдання, займаецца напаўненнем сайта прадпрыемства» [4, с. 84] таксама можа сведчыць пра тое, што кіраўніцтва выдання дбае пра тое, каб задаволіць інфармацыйныя патрэбы розных, у першую чаргу, па сваіх узроставых характарыстыках, чытачоў.

У дызайне сайта газеты «Хойніцкія навіны» прэвалюе зялёны колер і яго адценні, што карэлюе як з колеравай гамай афіцыйных геральдычных сімвалаў г. Хойнікі – сцяга і герба, так і з колеравым вылучэннем назвы выдання ў яго папяровым увасабленні. Падобная колеравая акцэнтуацыя на сайце газеты павінна рэпрэзентаваць карыстальнікам меседж аб пераемнасці традыцыйнага сродку масавай інфармацыі (непасрэдна самой газеты «Хойніцкія навіны») і новага медыя (сайта выдання), а таксама на ўзроўні сімволікі замацоўваць у свядомасці аўдыторыі сувязь рэдакцыі газеты «Хойніцкія навіны» з органамі мясцовай улады, адлюстроўваць яе афіцыйны статус.

На галоўнай старонцы сайта выдання пад банерам з лагатыпам газеты месціцца радок з кнопкамі пераходу на іншыя старнокі сайта («Аб газеце», «Фотагалерэя», «Падпіска», «Рэклама», «Кантакты», «Каранавірус») і пошукавым фрэймам. Падобнае архітэктурнае рашэнне галоўнай старонкі сайта палягчае арыентацыю карыстальнікаў, дае ім магчымасць аператыўна атрымаць асноўную інфармацыю пра выданне і спосабы сувязі з супрацоўнікамі сродку масавай інфармацыі, аптымізуе навігацыю па інтэрнэт-старонцы, робіць яе інтуітыўна зразумелай.

Пад радком з кнопкамі пераходу па старонках сайта знаходзіцца слайдар «Свежыя навіны», які выдае вербалізаваныя спасылкі на апошнія публікацыі на сайце. Такі прыём прыцягнення чытацкай увагі да паведамленняў, размешчаных на інтэрнэт-старонцы выдання, з’яўляецца даволі дзейсным, паколькі дазваляе карыстальнікам за кароткі прамежак часу азнаёміцца са зместам інфармацыйных абнаўленняў на сайце. Аднак неабходна адзначыць: змена спасылак адбываецца даволі хутка, што перашкаджае карыстальнікам пры першасным прачытанні адразу ўсвядоміць змест паведамлення. Рэдактару інтэрнэт-старонкі газеты «Хойніцкія навіны» можна парэкамендаваць ці павялічыць час на адлюстраванне аднаго навінавага паведамлення, ці абмяжоўваць даўжыню сказа 4–5 словамі.

Наступны структурны блок на галоўнай старонцы сайта газеты «Хойніцкія навіны» ўтрымлівае фрэймы і слайдар з фотаздымкамі,

якія ілюструюць апублікаваныя на інтэрнэт-старонцы паведамленні. Фотаздымкі ўяўляюць сабой гіперспасылкі, што вядуць да адпаведных журналісцкіх матэрыялаў. Падобны падыход да гіпертэкставага структуравання інфармацыі на інтэрнэт-рэсурсах сучасных СМІ з’яўляецца класічным, яго выкарыстанне супрацоўнікамі рэдакцыі газеты «Хойніцкія навіны», безумоўна, можна лічыць абгрунтаваным і дзейсным з гледжання аптымізацыі юзабіліці сайта медыйнай арганізацыі.

Далей галоўная старонка сайта газеты «Хойніцкія навіны» падзяляецца на два блокі. Першы блок, які займае 2/3 шырыні інтэрнэт-старонкі, утрымлівае банеры-гіперспасылкі з візуальнай (фотаздымкі) і тэкставай інфармацыяй, размешчанай па рубрыках «Грамадства», «Улада», «Эканоміка», «Сельская гаспадарка», «Нашы праекты», «Адукацыя», «Культура», «Спорт», «Навіны краіны». У другім блоку, які займае 1/3 шырыні інтэрнэт-старонкі, месцяцца іконкі з выявамі лагатыпаў сацыяльных сетак, у якіх рэдакцыя газеты вядзе блогі; тэкставая стужка навін; блокі з тэматычным відэакантэнтам; інтэрактыўны каляндар; інфаграфіка з прагнозам надвор’я; банеры, якія спасылаюцца на староннія рэсурсы. У «падвале» старонкі сайта газеты «Хойніцкія навіны» месціцца банер са спасылкай на інфармацыю пра гісторыю выдання, кантакты галоўнага рэдактара і адрас рэдакцыі, адрас электроннай пошты рэкламнага аддзела, лічыльнікі наведвальнікаў, знак аховы аўтарскага права з найменнем выдання.

Трэба падкрэсліць, што з-за выкарыстання вялікай колькасці банераў-гіперспасылак з фотаматэрыяламі галоўная старонка сайта становіцца вельмі доўгай, што перашкаджае карыстальнікам хутка знаходзіць інфармацыю, напрыклад, у рубрыках «Культура», «Спорт» і «Навіны краіны». На наш погляд, рэдакцыі газеты мэтазгодна было б частку гіперспасылак на апублікаваныя матэрыялы даваць у тэкставым варыянце без фотаматэрыялаў, каб скараціць плошчу, якую займаюць буйныя фотабанеры і паменшыць даўжыню галоўнай старонкі сайта. Таксама ў якасці парады па паляпшэнні юзабіліці сайта газеты «Хойніцкія навіны» рэдакцыі выдання можна рэкамендаваць утрымацца ад дублявання гіперспасылак на адзін і той жа журналісцкі матэрыял, аформленых пры дапамозе візуальнага і тэкставага паведамленняў.

Старонка газеты «Хойніцкія навіны» ў інтэрнэце адрозніваецца аптымальным дызайнам, разам з тым, падчас аналізу яе юзабіліці, былі ваяўлены пэўныя недасканаласці, якія гіпатэтычна могуць перашкаджаць карыстальнікам у навігацыі па сайце. Удасканаленне працы сайта

газеты «Хойніцкія навіны» звязана выключна з тэхнічнымі момантамі і не павінна цягнуць за сабой дадатковыя фінансавыя выдаткі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. О газете // Хойніцкія навіны [Электронный ресурс]. URL: http://www.hoiniki.by/?page_id=3527 (дата обращения: 30.04.2021).
2. *Зелянко С. В.* Гендарныя падыходы да рэдакцыйнай падрыхтоўкі медыятэкстаў // Журналістыка-2015: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 17-й Міжнар. навук.-практ. канф., 12–13 ліст. 2015 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 17. Мінск : БДУ, 2015. С. 274–277.
3. Контакты // Хойніцкія навіны [Электронный ресурс]. URL: http://www.hoiniki.by/?page_id=3531 (дата обращения: 30.04.2021).
4. *Зелянко С. В.* Методыка рэдагавання : вучэб.-метад. комплекс. Мінск : БДУ, 2017. 88 с.

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ ГАЗЕТЫ «КОБРЫНСКІ ВЕСНІК» У ІНТЭРНЭЦЕ

***В. А. Зразікава[1], М. У. Гапанюк[2]***

*[1]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
zrazikova@tut.by,*

*[2]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
margapanyuk@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці функцыянавання рэгіянальных СМІ ў анлайнавым асяродку, а таксама прынцыпы размяшчэння кантэнту на розных медыйных платформах.

Асобная ўвага нададзена прасоўванню раённай газеты «Кобрынскі веснік» у сацыяльных сетках.

Сёння не ўсе рэгіянальныя СМІ маюць дакладнае ўяўленне аб творчых прыёмах працы ў інтэрнэце і паспяховай стратэгіі дзейнасці, у выніку чаго назіраецца нізкая наведвальнасць інтэрнэт-рэсурсаў пры даволі высокіх друкаваных тыражах.

***Ключавыя словы:*** аўдыторыя; газета «Кобрынскі веснік»; інтэрнэт; інфармацыйны партал vkobrine.by; рэгіянальныя СМІ; сайт; сацыяльныя сеткі.